Працягласць жыцця вышэйзгаданых мікраарганізмаў на думку лекара-дыетолага Вікторыі Болбат складаюць толькі 6-7 дзён, а тэрмін захоўвання ёгуртаў беларускіх вытворцаў складае 1 месяц. Акрамя малочнакіслых бактэрый, у склад прадукта ўваходзіць глутацыён, які выконвае антыаксідантную функцыю ў арганізме і ўбіхінон (кафермент Q10). Акрамя каферментнай функцыі, убіхінон выконвае таксама антыаксідантную функцыю. Дадзеныя дабаўкі асабліва актуальныя для дзяцей, якія аддаюць перавагу ўжыванню ёгурту.

**Высновы:**

1. У гандлёвых сетках Еўраопт і Green прадстаўлены 6 фірмаў беларускіх вытворцаў ёгурту.
2. У іх склад уваходзяць прабіётыкі, аднак фірмы-вытворцы, за выключэннем "Савушкін прадукт", не ўдакладняюць, якія менавіта мікраарганізмы ўваходзяць у склад дадзенага прадукта.
3. У склад ёгурта, акрамя прабіётыкаў, беларускія вытворцы ўводзяць вітамінныя комплексы, такія як убіхінон і глутацыён, што спрыяльна ўплывае на функцыі арганізма.
4. Тэрмін прыдатнасці прадукта перавышае тэрмін жыццядзейнасці ў ім мікраарганізмаў. Таму для паляпшэння мікрафлоры кішачніка варта купляць ёгурт, улічваючы працягласць жыцця мікрафлоры (6-7 дзён).

## ЗАГАДКІ ПРА ГОД
## ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ МОЎНАЙ КАРЦІНЫ СВЕТУ

**Шапрунова В. С.,**
студэнтка 3 курса меліяратыўна-будаўнічага факультэта
УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія»
Кафедра лінгвістычных дысцыплін
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Дабіжы С.П.

Загадка – гэта моўная адзінка, якая выкарыстоўваецца ў актах камунікацыі з мэтай зносін, абмену інфармацыяй, праверкі кемлівасці, а таксама кадзіравання табуіраванай лексікі. Загадка рэалізуецца двума актыўнымі выканаўцамі, адзін з якіх ажыццяўляе іншасказальнае апісанне аб'екта, яго параметраў або функцый, а другі – адгадвае зашыфраваны ў іншасказальным апісанні аб'ект.

Загадкі характарызуюцца іншасказальнасцю, багаццем вобразных асацыяцый, сэнсавай ёмістасцю, структурна-семантычнай завершанасцю і, несумненна, блізкасцю да народнай гаворкі. Як адзначае А. П. Квяткоўскі, загадка ўяўляе сабой пабудаваны ў выглядзе іншасказання невялікі фальклорны твор, які змяшчае мудрагелістае пытанне, на якое неабходна даць вычарпальны адказ [3, с. 83].

Нягледзячы на тое што большая частка народных загадак прысвечана самым простым і звыклым прадметам хатняга ўжытку, а таксама дзікім і хатнім жывёлам, прыродным з'явам, яны раскрываюць паэтычны бок гэтых прадметаў

Рэпозиторий ГрГМУ

і з’яў. Апісанне будуецца на аснове розных відаў асацыятыўных сувязяў, выкліканых ужываннем тых ці іншых разнавіднасцяў тропаў.

Метафара ў загадках характарызуе спецыфіку іх зместу і формы, ляжыць у аснове іх стылістычнай і кампазіцыйнай арганізацыі, вызначае самі творчыя прынцыпы мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Метафара – душа загадкі. Зразумець метафару – значыць зразумець саму загадку, раскрыць яе сутнасць, вызначыць яе жанравыя асаблівасці. Першым, хто адзначыў асаблівую ролю метафары ў загадцы, быў Арыстоцель, які вызначыў сутнасць загадкі ў адлюстраванні фактаў у немагчымым моўным спалучэнні, што не можа быць выканана з дапамогай простай паслядоўнасці звычайных слоў, а толькі пры дапамозе метафар.

В. П. Анікін, даследуючы функцыянальныя асаблівасці загадак, лічыў, што першапачаткова загадкі мелі іншы сэнс і ўжываліся ў тыя моманты, калі з нейкіх прычына было забаронена ўжыванне слоў. Такім чынам, В. П. Анікін увёў ў фалькларыстыку гіпотэзу аб дачыненні загадкі да табу. На думку В. П. Анікіна, загадка ўяўляла сабой не традыцыйны спосаб зносін, а патаемную, умоўную гаворку [1, с. 28]. Зразумела, з цягам часу функцыянальныя асаблівасці загадак падвяргаліся зменам: загадкі ператварыліся са спосабу зносін і абмену інфармацыяй у забаўку для дзяцей, накіраваную на праверку кемлівасці і вастрыні розуму.

Загадкі ўяўляюць сабой своеасаблівы спосаб адлюстравання нацыянальнай карціны свету, раскрываючы перад намі логіку, мысленне, светаўспрыманне этнасу. Вывучэнне беларускіх і рускіх загадак як аднаго са старажытнейшых жанраў вуснай народнай творчасці дазваляе апісаць мадэль Сусвету ва ўяўленнях усходнеславянскіх народаў.

Разгледзім прыклады рускіх і беларускіх загадак, аб’ектам якіх з’яўляецца год. Большую частку загадак гэтай тэматыкі складаюць тэксты, арганізаваныя на аснове абазначэння колькаснай характарыстыкі частак дэнатату:

*Вышел старик-годовик, махнул рукавом, и полетели двенадцать птиц: у каждой птицы по четыре крыла, в каждом крыле по семи перьев, каждое перо с одной стороны черное, а с другой белое* [4, с. 184].

У большасці індаеўрапейскіх народаў цэнтрам Сусвету лічылася Прадрэва, ці Сусветнае Дрэва, якое, згодна з народнымі ўяўленнямі, звязвае зямлю і неба. Само Дрэва ў народным уяўленні мае тры ўзроўні, падзелена на тры часткі: Ніжні, Сярэдні і Верхні Свет. Чалавек, яго дом, сям’я, дзікія і хатнія жывёлы – усё месціцца ў Сярэднім Свеце. А само Дрэва найчасцей уяўляецца дубам або яварам.

*Стоит дуб:*
*На дубу двенадцать ветвей,*
*На каждой ветке по четыре отростка,*
*На каждом отростке по семи прутьев* [4, с. 62].

Міфалагічнае ўяўленне пра явар абумовіла яго галоўную ролю ў многіх абрадах і фальклорных тэкстах і захавала вобраз гэтага дрэва ў вуснай народнай творчасці. Так, у беларускай вясельнай песні адлюстравана своеасаблівая прыродная іерархія:



Репозиторий ГрГМУ

*Зялёны ягор – то татулечка мой,*
*Бела яблынька – то матулечка мая,*
*Зялёны дубы – то брацейкі мае,*
*Белы вішанькі – сястрыцы мае* [2, с. 123].

У ролі Суветнага Дрэва можа выступаць і гарох – расліна, якая імкнецца ўвысь, да сонца. У славянскіх загадках па гаросе ідзе шлях на неба, у тэкстах варажбы гароху прыпісываюцца магічныя якасці. А ў рускай загадцы пра год гарох увасабляе дні: *На двенадцать рогож рассыпался горох* [4, с. 261].

Народныя загадкі адлюстроўваюць асаблівы характар светаадчування народа. Вывучэнне групы рускіх і беларускіх загадак пра год сведчыць пра агульнасць старажытных уяўленняў усходніх славян пра мадэль будовы Сусвету. На думку нашых продкаў, Сусвет – гэта і есць Сусветнае Дрэва, якое стаіць у цэнтры кола і вакол якога бурліць жыццё.

**Літаратура:**


1. Аникин, В. П. К мудрости ступенька. О русских песнях, сказках, пословицах, загадках, народном языке / В. П. Аникин. – М. : Детская литература, 1988. – 176 с.
2. Вяселле. Песні : у 6 кн. / склад. Л. А. Малаш, Я. Мажэйка, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – Т. 3. – 640 с.
3. Квятковский, А. П. Поэтический словарь / А. П. Квятковский. – М. : Сов. энциклопедия, 1966. – 375 с.
4. Пословицы. Поговорки. Загадки / сост. А. Н. Мартынова, В. В. Митрофанова. – М.: Современник, 1986. – 344 с.


## ТРАДЫЦЫЙНАЯ РАДЗІННАЯ АБРАДНАСЦЬ ПАНЯМОННЯ І ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ЯЕ НА ЎЗРОЎНІ СЯМЕЙНАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў ГОРАДЗЕ СКІДЗЕЛЬ 1970-80-я гг.


**Шымчук Е.І.,**
студэнтка 2 курса лячэбнага факультэта

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт»
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к. г. н., ст. выкладчык Чарнякевіч І.С.


Вывучэнне традыцыйнай абраднасці беларусаў і асаблівасцей трансфармацыі яе функцыянавання дае магчымасці прасачыць кірункі развіцця этнічнай культуры, гранічным праяўленнем якой з’яўляецца яе ўвасабленне ў сямейнай традыцыі. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем прасачыць захаванне асобных элементаў радзіннай абраднасці беларусаў Панямоння ў асобнай сямейнай традыцыі жыхароў г. Скідзель у 70–80-я гады ХХ стагоддзя.

Разгорнуты комплекс традыцыйных радзінных звычаяў і абрадаў складаўся з трох шчыльна звязаных цыклаў: randавага... 



Репозиторий ГрГМУ